Васіліна МІЦКЕВІЧ,
галоўны захавальнік фондаў
Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа,
Наталля ШУВАГІНА-АДАМОВІЧ,
навуковы супрацоўнік аддзела фондаў
Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа

# ЯКУБ КОЛАС І КУЗЬМА ЧОРНЫ: ЖЫЦЦЁВЫЯ І ТВОРЧЫЯ ПАРАЛЕЛІ

У артыкуле "Класік беларускай прозы" Алесь Адамовіч адзначаў: «Калі дваццацітрохгадовы светлавалосы юнак з добрымі і сур'ёзнымі блакітнымі вачамі пачаў у 1923 годзе падпісвацца сакавітым і тлустым, як сама зямля Случчыны, псеўданімам "Кузьма Чорны", проза беларуская яшчэ не каласілася шырокім ураджайным масівам». Разам з Якубам Коласам, Максімам Гарэцкім, Змітраком Бядулем, маладымі ў той час празаікамі Міхасём Лыньковым, Кандратам Крапівой і іншымі Кузьма Чорны стаяў ля вытокаў фарміравання высокамастацкай, шматстылёвай і шматжанравай беларускай прозы. У гэтым годзе адзначалася яго 120-годдзе. Кузьма Чорны – выбітны беларускі пісьменнік, празаік, драматург, публіцыст і перакладчык, якога справядліва называюць беларускім Дастаеўскім і Гамсунам. З Кузьмой Чорным быў добра знаёмы, перапісваўся і сябраваў класік беларускай літаратуры Якуб Колас. Іх жыццёвым і творчым стасункам і прысвечаны наш артыкул.

Кузьма Чорны (сапраўднае імя Мікалай Карлавіч Раманоўскі) нарадзіўся 11 (24) чэрвеня 1900 г. у маёнтку Боркі на Случчыне, у сям'і панскага парабка. Пазней сям'я пераехала ў Цімкавічы, дзе будучы пісьменнік скончыў пачатковае вучылішча. Пра дзіцячыя гады ён пісаў: "*Гэта быў жудасны час, калі кавалак хлеба і палатняная рубашка – адна на год, здавалася шчасцем. Так жылі ўсе тыя людзі, сярод якіх я вырас і выгадаваўся. Так жыў народ. Бацькі мае цьмяна марылі аб нейкай невядомай ім лепшай долі для сваіх дзяцей*". У 1916 г. юнак паступіў у Нясвіжскую настаўніцкую семінарыю: "*гэта была найбольш зручная школа для тых, хто не меў за што вучыцца: там не бралі платы за навуку, а лепшым вучням давалі стыпендыю*". Раней за К. Чорнага ў Нясвіжскай семінарыі вучыўся Я. Колас (1989–1902), які выказваў падобныя думкі: "*…семінарыя з'ўлялася нібы продухавінай. Куды яшчэ маглі падацца сялянскія дзеці?.. Хто лепш вучыўся – залічалі на казённы кошт. Рублёў дваццаць з нечым прыпадала на нос у кожную чвэрць. За гэтыя грошы нас кармілі, адзявалі, куплялася папера*". Але ў адрозненне ад Я. Коласа скончыць семінарыю К. Чорны не змог, бо ў 1919 г. яе зачынілі польскія ўлады.

Першыя апавяданні К. Чорнага надрукаваны ў дзіцячым часопісе ў 1921 г. У 1923 г. ён паступіў на літаратурнае аддзяленне педагагічнага факультэта БДУ, дзе правучыўся два курсы. Менавіта ў 1923 г., 16 кастрычніка дэканат педагагічнага факультэта пацвердзіў абранне Канстанціна Міхайлавіча Міцкевіча (Якуба Коласа) на пасаду выкладчыка беларускай мовы.

З 1923 г. Кузьма Чорны – член літаб'яднання "Маладняк". Яшчэ будучы студэнтам, у 1924 г. ён пачаў працаваць у газеце "Беларуская вёска". У 1925 г. выйшлі першыя кнігі – "Апавяданні" і "Срэбра жыцця". У 1926–1931 гг. пісьменнік быў старшынёй літаб'яднання "Узвышша" а ў 1932–1937 гг. – галоўным літкансультантам кабінета маладога аўтара пры Саюзе пісьменнікаў БССР. Член Саюза пісьменнікаў БССР з 1934 г.

Кузьма Чорны сустракаўся з Якубам Коласам, сумесна працаваў з сярэдзіны 1920-х гг.: на нарадах беларускіх пісьменнікаў па розных пытаннях літаратуры, утварэнні рэпертуару для беларускіх тэатраў, на вечарах беларускай літаратуры. У 1926 г. яны разам удзельнічалі ў акадэмічнай канферэнцыі па рэформе беларускага правапісу і азбукі.

З 1925 да 1932 г. выйшлі зборнікі апавяданняў К. Чорнага, пазней аповесці і раманы: "Сястра", "Зямля", "Лявон Бушмар", "Трэцяе пакаленне", "Пошукі будучыні". Побач з раманамі і апавяданнямі ў 1930-я гг. пісьменнік стварыў і драматургічныя творы: "Бацькаўшчына", "Ірынка". У асабістай бібліятэцы Я. Коласа захоўваюцца дзве кнігі К. Чорнага: "Выбраныя творы" (1934) і "Трэцяе пакаленне" (1935).

27 мая 1932 г. была прынятая пастанова ЦК КП(б)Б "Аб перабудове літаратурна-мастацкіх арганізацый БССР", у якой Колас і Чорны былі вылучаны ў арганізацыйнае бюро для ўдзелу ў стварэнні Саюза савецкіх пісьменнікаў. Гэтай пастановай К. Чорны быў прызначаны рэдактарам часопіса "Беларусь калгасная". У тым жа 1932 г. К. Чорны ўвайшоў у склад камісіі для правядзення святкавання 50-гадовага юбілею Я. Коласа. Яны абодва былі абраныя дэлегатамі І Усесаюзнага з'езда савецкіх пісьменнікаў, дзе К. Чорны выступіў з прамовай. Знакавая падзея для маладога літаратара.

На I з'ездзе Я. Колас уздымаў праблему працы над сабою сярод пісьменнікаў, а ў артыкуле "Вучоба пісьменнікаў – важнейшая задача" за 1934 год класік пісаў: "*Я не буду гаварыць аб канкрэтных шляхах павышэння нашай пісьменніцкай кваліфікацыі… Усякі, хто захоча вучыцца, знойдзе і спосабы для гэтага. Тым больш, што спосабаў ёсць многа… Той з нас, хто не стаіць на месцы, а ідзе наперад, працуючы над сабой, робіць і поспехі. Я назаву Кузьму Чорнага, Глебку, Крапіву, Зарэцкага, Галавача, Мікуліча. Іх творчая прадукцыя, у выніку работы над сабой, мае бясспрэчнае дасягненне*".

14 кастрычніка 1938 г. К. Чорны быў беспадстаўна арыштаваны. 8 месяцаў сядзеў у мінскай турме, з іх 6 – у камеры-адзіночцы. Следчыя рэгулярна катавалі вязня, што адбілася на стане здароўя пісьменніка і значна паменшыла яго жыццёвы шлях. К. Чорны – першы беларускі савецкі пісьменнік, які пакінуў у дзённіку сведчанні пра зверствы НКУС.

Якуб Колас адбыў тры гады турэмнага зняволення ў мінскім астрозе за ўдзел у нелегальным настаўніцкім з'ездзе (з 1908 да 1911 г.), таму як ніхто іншы перажываў за лёс маладога таленавітага пісьменніка. Старэйшы сын класіка Даніла Міцкевіч успамінаў: «Бацька расказваў, што яшчэ да вайны пытаўся ў яго сам Панамарэнка: "Что бы вы сказали о Черном?" А пісьменнік тады сядзеў у турме. Вядома ж, Колас, як і належыць, пахваліў свайго малодшага калегу – верны, сумленны чалавек, выдатны пісьменнік. Той выслухай, набраў тэлефон: "Лаврентий Фомич! Мнения сходятся. Освободить!" Лаўрэнцій Фаміч – гэта Цанава». Нявысветленым засталося, з чымі думкамі супалі Коласавы. Пераканаўчым для П. Панамарэнкі – аўтара ліста І. Сталіну "О белорусском языке, литературе и писателях", дзе сцвярджалася, што беларускія нацыянал-дэмакраты маюць паталагічную нянавісць да рускага народа, яго культуры і мовы, – стала тое, што Я. Колас падаў К. Чорнага як выдатнага перакладчыка рускай літаратуры, у тым ліку твораў Пушкіна, Гогаля, Астроўскага, Горкага, Караленкі. Змардаваны душой і целам пісьменнік быў вызвалены 8 чэрвеня 1939 г.

Якуб Колас таксама знаходзіўся пад пагрозай арышту. У кастрычніку 1938 г. народны камісар унутраных спраў БССР А. Наседкін у лісце да П. Панамарэнкі характарызуе Коласа як аднаго з лідараў нацдэмаўскага руху на Беларусі і польскага шпіёна. Ужо былі запрошаны санкцыі на арышт Я. Коласа і яго сябра і паплечніка Я. Купалы. У лісце да І. Сталіна ад 21.11.1938 г. П. Панамарэнка пісаў: "В отношении Янки Купалы имеется 41 показание, в большинстве прямые; Якуба Коласа – 31 показание; Крапивы – 12 показаний… По количеству и качеству изобличающего материала, а также по известным нам фактам их работы, они, безусловно, подлежат аресту и суду, как враги народа". Панамарэнка добра разумеў, што справа складаная, бо і Колас, і Купала людзі шырока вядомыя на Беларусі. У выніку было прынята рашэнне і "ордары" былі заменены на "ордэны", спіс работнікаў Беларусі, прадстаўленых да ўзнагароды ў сувязі з 20-годдзем БССР, пачынаўся прозвішчамі Купалы і Коласа.

Тры новыя раманы К. Чорнага, аб'ёмнае літаратуразнаўчае даследаванне паэмы "Новая зямля" Я. Коласа згарэлі ў першыя дні вайны.

У 1941–1944 гг. Кузьма Чорны знаходзіўся ў эвакуацыі (пераважна ў Маскве). Удзельнічаў у выданні газеты-плаката "Раздавім фашысцкую гадзіну", з якой супрацоўнічаў і Якуб Колас. Падчас Другой сусветнай вайны апошні быў у эвакуацыі ў Ташкенце. З перапіскі пісьменнікаў ваеннага часу захаваліся два лісты:

«*Дарагі мой, мілы Канстанцін Міхайлавіч!*

*Пішу Вам у настроі вядома якім: смутак аб Беларусі не дае спакою. Урэшце гэта ўжо не настрой, гэта стала натурай. Так дзень за днём і ідзе, і ўсё чакалася, што гэта скора скончыцца. Але і цяпер я ў вялікі песімізм не падаюся. Лета гарачае мы перабылі, і цяпер наперадзе больш прасвятлення, як было раней. Пакуль што знаходжу забыццё і ўцеху ў працы. У гэтыя дні якраз пішу біяграфію Янкі Купалы, для зборніка, прысвечанага яго памяці. Вайна і страта роднай зямлі выбіла нас з каляіны, і мы яшчэ не можам як мае быць ацаніць да канца, якую страту мы панеслі ад смерці Янкі Купалы, і што значыце ён і Вы для цэлай эпохі жыцця нашага народа. Гэта жывая гісторыя, і на ўсіх нас вялікі абавязак, каб яно ўсё не забылася, больш таго, каб з-пад нашых пер'яў вырасла ў вялікія вобразы. Я глыбока ўпэўнены ў тым, што ніколі як цяпер і ва ўсе наступныя гады, беларускі пісьменнік будзе і гісторыкам (можа, у пэўным сэнсе), і крытыкам літаратуры, і даследчыкам яе. І толькі так, скарыстаўшы ўсё нам дадзенае, мы не дарма для нашага народа і роднай зямлі пражывём сваё жыццё.*

*З новай сілай паўстае перада мной прывабная і трагічная сваім лёсам беларускага простага чалавека постаць Міхала з "Новай зямлі". Усё будзе добра, вернемся на родную зямлю, па-новаму ацэнім вялікае шчасце жыць на ёй, і я зноў вярнуся да Міхала. Ён не дае мне спакою якраз у гэтыя дні смутку і надзей…*

*…Хочацца многае сказаць. Прыемна ведаць і адчуваць, што ёсць на свеце чалавек любы і дарагі, душа якога так многа змяшчае ў сабе, што зразумее і мяне – і не асудзяць строга і за маё доўгае маўчанне, і за сумбурныя думкі. Шчырае прывітанне Марыі Дзмітраўне! Няхай яна будзе здаровая і радасная. Да мяне прыехала мая сям'я… І мы цяпер жывём у Маскве ўтраіх. Дзень за днём, тыдзень за тыднем – і прыйдзе шчасце варочацца на родную зямлю.*

*Ваш Кузьма Ч. 26.VII. 42 г.*».

У адказ 29 жніўня 1942 г. Чорны атрымаў ліст:

"*Дарагі Кузьма!*

*Прымі маё сяброўскае беларускае шчырае прывітанне. Даўно мне хочацца напісаць табе хоць некалькі словак. Змаркоціўся я без ляшчоў, без баравікоў. Нават сняцца яны мне тут рэдка, а думаю аб іх часта. Не так аб баравіках, як аб той зямлі і тых лясах, што родзяць баравікі. Цяжкія хвіліны перажываў я тут, бо сябры мае далёка, бо рэдка даходзіць да мяне іх слова. Мне прыслаў т. Кавалёў і твае фельетоны. Дзякую табе за іх напісанне. Трэба было б нешта прыдумаць, каб ашальмаваць тых сволачаў-пісак, што ліжуць зад Гітлера…..*

*Выпі чарачку за мой сум па роднай зямлі, па нашым мілым дарагім народзе. Няхай восеньскае сонца 1942 года абласкае яго, сагрэе цеплынёй вызвалення.*

*Цалую цябе. Твой Я. Колас*".

Якуб Колас перажываў за К. Чорнага, у лістах да сяброў і знаёмых класік часта згадваў пісьменніка, цікавіўся станам яго здароўя, перадаваў прывітанні. Так, напрыклад, 28 лістапада 1942 г. Міхась Лынькоў напісаў Коласу, што Чорны ляжыць у вельмі цяжкім і небяспечным стане ўжо колькі дзён. У адказ Колас піша Міхасю Ціханавічу: "*Што ж гэта з Кузьмою за напасць такая? Скажы яму, няхай не падае духам – абміне яго ліха: беларускі чалавек цягавіты*".

Кузьма Чорны прысвяціў Якубу Коласу артыкул "Вялікі паэт беларускага народа", дзе адзначаў: "*Уся творчасць вялікага паэта ёсць найглыбейшае адлюстраванне жыцця беларускага народа за некалькі самых бурных і яркіх дзесяцігоддзяў яго гісторыі. Выйшаўшы з самых глыбінь народа, Якуб Колас стаў песняром народнай душы. Імя яго ёсць гордасць народа*".

Падчас вайны К. Чорны працаваў над раманамі "Вялікі дзень" (1941–1944), "Пошукі будучыні" (1943), "Млечны Шлях" (1944), аповесцямі (засталіся незакончанымі) "Сумліцкая хроніка", "Смага". Апошнія творы пісьменніка доўгія гады заставаліся ў рукапісах.

«*Трэба прагледзець "Млечны шлях" Кузьмы Чорнага. Перапісана слепа, чытаць цяжка. Напісана мнагаслоўна. Трудна вылузваць асноўнае…*» – напісаў Я. Колас у 1944 г. у дзённіку "Таворыць Клязьма". Твор быў прачытаны класікам да канца: "*Задумана аповесць няблага. Бракуе ёй яснасці, прастаты. Мала адшліфавана*". Але пры ўсім тым, даючы крытычную ацэнку, Колас параўноўвае Чорнага з нобелеўскімі лаўрэатамі: "*Як у Метэрлінка, у Кузьмы Чорнага персанажы пазнаюць сябе ў сваіх узаемаадносінах па маўчанні, па тых ледзь улавімых ценях і рухах на твары, якія праяўляюцца ў той ці іншы момант. Манера гаварыць паміж сабою такая ж, як і ў персанажаў Кнута Гамсуна*".

У гады вайны ў К. Чорнага выйшлі зборнікі фельетонаў "Кат у белай манішцы" (1942) і апавяданняў "Вялікае сэрца" (1945). У верасні 1944 г. ён вярнуўся ў Мінск, працаваў у рэдакцыі часопіса "Беларусь". Памёр ад інсульту ў вылучанай Саўнаркамам кватэры-пакоі 22 лістапада 1944 г. Я. Колас пісаў паэтцы і перакладчыцы Святлане Сомавай: "*23 ноября умер наш белорусский писатель Кузьма Чорный. Это – лучший наш писатель. Прекрасный человек. Белорусские писатели понесли за войну тяжелые утраты*". У асабістым архіве Я. Коласа захоўваецца верш беларускага паэта "Памяці Кузьмы Чорнага" Юркі Гаўрука, які раней не друкаваўся. Пісьменнікі былі знаёмыя з часоў маладнякоўскіх літаратурных сустрэч. Юрка Гаўрук, паэт, зямляк Кузьмы Чорнага, быў беспадстаўна арыштаваны і высланы з Беларусі ў 1935 г. Верш быў дасланы Я. Коласу з ссылкі:

Не бачыць мне тваёй магілы
І не прыпасці да яе.
Чаму так рана, дружа мілы,
Зляжыў ты ручанькі свае?

Няўжо не вытрымала сэрца
Ліхіх нягод і перагас?
Гады юнацтва і братэрства
Ізноў вяртаюцца да нас.

У цішыні, у зімнім змроку
Мне часта чуўся гоман хвой.
Табе прывет я шлю здалёку,
Благаслаўляю вобраз твой.

Ты знаў усё: журбу, адчайнасць,
І добры смех, і шчыры гнеў,
То падымаўся надзвычайна,
То ў апраметную глядзеў.

І пад асенняю звяздою,
Калі на стрэхах дождж імжыў,
Ішоў ты ціхаю хадою,
Аб шчасці марыў і тужыў.

І ў жаласці тваёй глыбокай
Была вялікая любоў.
З душою чыстаю, як вока,
Ад нас ты ў зямлю адыйшоў.

Мой любы дружа, мілы, мілы,
Шчаслівым будзе новы свет!
І да тваёй святой магілы
Не зарасце ніколі след.

"*Намоцна запісаныя ў гісторыі беларускай літаратуры заўчасна памёршыя маладыя пісьменнікі: празаік буйнейшага і яскравейшага таленту Кузьма Чорны, выдатны паэт Паўлюк Трус, праніклёны майстар Эдуард Самуйлёнак*", – пісаў Я. Колас у артыкуле "Культура і навука БССР за

30 год" (1949). Не раз адзначаў талент К. Чорнага ў публіцыстычных тэкстах: "…*уместно отметить работу крупнейшего белорусского прозаика Кузьмы Чорного. Он незаслужено малоизвестен союзному читателю. Переводов его произведений на русский язык явно недостаточно. Кузьма Чорный смело вводит нас в широкий мир страстей, отношений, поступков, где складывается характер человека. Не зглаживая противоречий в образе, он вскрывает их, достигая цельности созидаемого характера. Герои Чорного проходят сложные пути роста… Образы К. Чорного глубоко самобытны, но в то же время настолько широко обобщены, что перерастают национальные рамки. По силе изображения, по глубине проникновения в человеческую психологию этот яркий талант стоит на одном из первых мест в белорусской прозе*"; "*вельмі пакаэальнай у адносінах моўнай дбайнасці, чыстаты, цікавай пабудовы сказаў, з'яўляецца пісьменніцкая работа Кузьмы Чорнага. Літаратурная спадчына гэтага, так рана памёршага, мастака патрабуе самай пільнай увагі з боку як літаратурнай моладзі, так і старшых пісьменнікаў. Там ёсць шмат чаму павучыцца: пісьменнік умеў адкрыць новае гучанне слова, умеў выказваць усё, што турбавала яго, з вялікай дасканаласцю*".

У 2016 г. у выдавецтве "Мастацкая літаратура" ў серыі "Жыццё знакамітых людзей Беларусі" выйшла кніга "Кузьма Чорны. Чалавек – гэта цэлы свет", дзе ўпершыню былі надрукаваны матэрыялы з эпісталярнай спадчыны пісьменніка. У тым ліку і прыведзеныя вышэй. Незаўважаным застаўся ліст К. Чорнага да Уладыслава Чаржынскага (псеўданім *У. Дзяржынскі*; крытык і літаратуразнаўца, супрацоўнік Інбелкульта і Беларускай акадэміі навук), захаваны ў фондах Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Я. Коласа. Чаржынскі, як і К. Чорны, адчуў на сабе зверствы тагачаснай сістэмы, быў арыштаваны 28 чэрвеня 1930 г., а 10 красавіка 1931 г. – беспадстаўна асуджаны і высланы ў Казань тэрмінам на 5 гадоў. Пасля арышту і высылкі адышоў ад літаратурнай дзейнасці. Застаўся жыць у Казані. Працаваў там выкладчыкам у розных ВНУ. Рэабілітаваны толькі 10 чэрвеня 1988 г. Чаржынскі быў добра знаёмы з Я. Коласам, у Збор твораў песняра ўвайшла іх перапіска 1940–1950-х гг. Класіку прыемна было чуць "*голас далёкага друга*", менавіта такую пазнаку ён зрабіў на адным з атрыманых лістоў. У лісце ад 20 мая 1944 г. Я. Колас прапаноўваў Чаржынскаму вярнуцца на Беларусь у якасці навуковага супрацоўніка Акадэміі навук: "*У інстытуце літаратуры і мовы Вам знойдзецца шырокае поле дзейнасці*". Акрамя таго, класік вельмі хацеў, каб той узначаліў арганізацыйную працу па стварэнні музея Янкі Купалы і тым самым дапамог Уладзіславе Францаўне Луцэвіч, жонцы паэта. На Беларусь У. Чаржынскі так ніколі і не вярнуўся, але ў 1966 г. перадаў у фонды музея Я. Коласа больш за 200 адзінак каштоўных прадметаў: кніг з дарчымі надпісамі класіка, рэдкіх выданняў 1920-х гг., рукапісаў і фотаздымкаў. У тым ліку і ліст К. Чорнага, які раней не друкаваўся, прывядзём яго цалкам:

*«Дарагі Уладыслаў!*

*З ласкі шчаслівага лёсу, я бадай што ўжо як мае быць, перамог вельмі цяжкую хваробу, якая была навалілася на мяне. Гэта быў вынік усяго перажытага. Я ўжо ачуняў; працую як належыць. Спадзяюся ў блізкім часе прыслаць табе новую сваю кнігу, раман, які я напісаў за час вайны. Але мусіць будзе так, што ты гэтую кнігу возьмеш у мяне сам. Напэўна, што цябе выклічуць на сталую працу ў Акадэмію. Справа гэтая падагрэта і не астывае. Літаратуразнаўства Ул. Дзяржынскага ацэньваецца як дасягненне беларускага савецкага літаратуразнаўства. Мне давялося з гэтай справай, не вельмі даўно, вельмі канкрэтна сутыкнуцца. Цяпер справа ўжо так павярнулася і так угрунтавалася, што твой сталы пераезд да нас цалкам у руках Я. Коласа. І ён два разы аб гэтым вельмі горача мне казаў. Але вядома, справа стаіць куды шырэй. Усяго я табе не магу пісаць, а толькі штоні-што, каб ты гэта ведаў і меў на ўвазе.*

*Калі будзеш мець час і жаданне, то напішы мне пару слоў. Мой адрас: Москва, ул. Горького, 49. Гостініца "Якорь", № 27. Н. К. Романовскому-Чорному.*

*Ад мяне найшчырэйшае прывітанне Гені і Рэні. Цалую цябе моцна. Твой Кузьма Чорны 12/ VI 44 г.».*

Якуб Колас клапаціўся пра лёс многіх людзей, дзеячаў беларускай навукі і літаратуры, беспадстаўна асуджаных і высланых з Беларусі, спрыяў іх вызваленню і вяртанню на радзіму для плённай працы на яе карысць. Гісторыі знаёмства і сяброўства класіка з Гаўрылам Гарэцкім, Уладыславам Чаржынскім, Кузьмой Чорным яркія таму пацвярджэнні.

На долю К. Чорнага выпала шмат выпрабаванняў. Ён проста хацеў жыць і тварыць, а даводзілася выжываць. І не толькі ў турме, дзе яго катавалі, але і пасля вызвалення. Пра гэта сведчаць пасляваенныя запісы ў дзённіку, які вёў пісьменнік: "*Яшчэ жыву на падлозе ў доме, дзе Саюз пісьменнікаў*", "*Нічога не пісаў. Няма дзе падзецца і прыткнуцца з пяром*". К. Чорны марыў жыць у Мінску ў ціхім кутку і пісаць! Кватэру далі дрэнную, як камера: "*бруд, цемень – вокны глядзяць у чорны трохкутнік з высокіх муроў. Пісаць няма як і жыць няма як*". Такія ўмовы ён звязваў не толькі з цяжкім пасляваенным часам, але і з сацыяльнай няроўнасцю, у якой апынулася інтэлігенцыя, бо кватэры чыноўнікаў былі светлымі і цёплымі. 9 ліпеня 1944 г. у дзённіку К. Чорны занатоўвае: "*Думаю аб той горкай праўдзе, што ніколі не меў магчымасці*

*пісаць тое, што самае важнае [ў] беларускай літаратуры і дзе б я сапраўды павярнуў бы горы. А то ўсё пішу на ўсякія прамежныя тэмкі, пасля якіх думаў, што пазатыкаю горлы дурням і брахунам і тады ўжо вазьмуся за тое вялікае, што хачу і магу напісаць*". Пісаць як хацелася перашкаджаў не толькі стан здароўя, але і цэнзары, якія нявечылі напісанае. К. Чорны адкрыта выступаў супраць тагачаснай цэнзаркі над усім друкам БССР Дадзіёмавай, якая не ведаючы беларускай мовы "*калечыць сваім алавіком мову беларускай літаратуры, думаючы гэтым паказаць начальству, што яна і ведае беларускую мову і займаецца ёю*". З пытаннем пра яе звальненне з пасады К. Чорны звяртаўся першага сакратара ЦК КП(б)Б П. Панамарэнкі.

Якуб Колас таксама перажываў з-за цэнзарскіх правак, якія змянялі твор да непазнавальнасці. У архівах КДБ быў знойдзены верш класіка, у якім ён з гумарам скрозь слёзы выказаўся наконт сваёй творчасці:

*Я ад ранку і да вечара араў,*
*А раллю маю рэдактар падабраў.*
*Назляталася і галак і гракоў*
*Ратаваць маю зямлю ад чарвякоў.*
*Ратавалі, талачыліся па ёй*
*І бяды мне нарабілі – ой-ё-ёй!*
*Зямля новая пакрыта дзірваном*
*І замоўк Сымон-Музыка са званом.*
*У глушы, глыбі Палесся толькі пні,*
*Адшчапенец мой закончыў свае дні.*
*Над распуснікам Савосем стаіць крыж,*
*Эх, нядоўга жыў на свеце ты, малыш.*
*Нічагусенькі няма на рубяжы,*
*Казкі жыцця мае леглі пад нажы.*
*Глушыць ніву маю дзікая трава.*
*Засталася ад мяне адно дрыгва.*
*Я ўстрывожаны спыняюся, стаю*
*І з журбой гляджу на спадчыну сваю.*
*А старанныя рэдактар, педагог*
*У няшчаснай маёй музы ловяць блох,*
*Вытрасаюць з яе, беднае, духі…*
*Няхай Бог ужо даруе ім грахі*
*Ды павузіць прагавітую іх пасць*
*І хоць трошкі болей розуму ім дасць.*

У часы смутку, выкліканая цяжкасцямі жыцця і нерэалізаванымі творчымі планамі, заставалася толькі маліцца: "*Божа, напішы за мяне ўсе мае творы*" – такі запіс пакінуў у дзённіку Кузьма Чорны ў апошні дзень жыцця…